УДК 821.161.3:8231

**Я. У. Кавальчук, Т. М. Пучынская**
Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 2 г. Салігорска», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. М. Горкага, 13, 223710 Салігорск, Рэспубліка Беларусь,
+375 (174) 236628 yanakovalchuk1999@mail.ru
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вул. Войкава, 21, 225404 Баранавічы, Рэспубліка Беларусь,
+375 (163) 68 01 59, philology@lenta.ru

# ЛІТАРАТУРНАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ СІРОЦТВА Ў ТВОРАХ СУЧАСНЫХ ПІСЬМЕННІКАЎ

У артыкуле цэласна разгледжаны асаблівасці літаратурнай рэпрэзентацыі сіроцтва ў сучаснай прозе на матэрыяле твораў Г. Марчука, У. Ягоўдзіка, У. Ліпскага. Ахарактарызаваны вобразы дзяцей-сірот, сюжэтныя лініі, жанравыя формы, адпаведныя дадзенай мастацкай ідэі, вызначана атрыбутыка «цяжкага» дзяцінства, прааналізавана праблема духоўнага сталення літаратурнага персанажа.

**Ключавыя словы:** матыў сіроцтва, герой-сірата, сучасная проза, рэпрэзентацыя.
Бібліягр.: 5 назваў.

**Y. Kovalchuk, T. Puchinskaya**
State Educational Institution ‘Secondary School No. 2 of Soligorsk’, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 13 M. Gorky str., Soligorsk, Republic of Belarus, 223710
+375 (174) 236628 yanakovalchuk1999@mail.ru
Educational institution ‘Baranovichi State University’, Ministry of Education of the Republic of Belarus, 21 Voykov str., Baranovichi, Republic of Belarus, 225404
+375 (163) 68 01 59 philology@lenta.ru

# THE MOTIVE OF ORPHANHOOD IN THE WORKS OF CONTEMPORARY BELARUSIAN WRITERS

The article highlights the problem of the motive of orphanhood in contemporary prose on the basis of H. Marchuk’s, U. Yahovdzik’s and U. Lipskiy’s works. The depiction of orphans is given, plot lines and genre forms are characterised from the point of view of fiction and non-fiction, the attributes of a "difficult" childhood are defined as well as the spiritual formation of a literary character is analysed.

Keywords: motive of orphanhood, orphan, contemporary prose, representation.
Ref.: 5 titles.

***Уводзіны.*** Сіроцтва з’яўляецца «вечнай» тэмай у літаратуры. У творах сучасных пісьменнікаў раскрываецца праблема не толькі фізічнага (смерць, хвароба бацькоў), але і сацыяльнага (ухіленне ад выканання бацькоўскіх абавязкаў) сіроцтва.

Актуальнасць праблемы даследавання абумоўлена наступнымі фактарамі.

1. Сіроцтва як «вечная» тэма ў мастацкай літаратуры прыцягвае ўвагу пісьменнікаў, чытачоў, грамадскасці.

2. Вывучэнне мастацкай прозы ў кантэксце літаратурнай рэпрэзентацыі дазваляе правесці шматаспектны аналіз твораў, спалучыць літаратуразнаўства з сумежнымі навуковымі дысцыплінамі (культуралогіяй, лінгвістыкай).

3. Аналіз праблемы абяздоленага маленства спрыяе асэнсаванню мастацкіх тэндэнцый у развіцці сучаснай беларускай прозы.

***Матэрыялы і метады даследавання.***

Матэрыялам даследавання сталі празаічныя творы сучасных пісьменнікаў: раман Г. Марчука «Кветкі правінцыі», аповесць У. Ягоўдзіка «Вочы начніцы»; кніга У. Ліпскага «Падкідыш».

Выкарыстаны біяграфічны, апісальны, параўнальна-супастаўляльны метады.

***Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.***

У адрозненне ад агульнай канцэпцыі маленства, якое можа быць шчаслівым або праблемным, сіроцтва традыцыйна асэнсоўваецца ў кантэксце мадэлі «антыдзяцінства» (Ф. Багушэвіч, Ядвігін Ш., Я. Колас, З. Бядуля, К. Чорны, Я. Маўр, А. Якімовіч, В. Вітка і

інш.). Сучасныя пісьменнікі працягваюць дадзеную традыцыю, якая шырока выяўляецца і ў вуснай народнай творчасці.

Матыў сіроцтва часта рэпрэзентуецца ў творы праз аўтабіяграфічны пачатак, асабістыя перажыванні герояў, звязаныя са стратай бацькоў у дзяцінстве. Аўтабіяграфізм у раскрыцці лёсу героя-сіраты прысутнічае ў рамане Г. Марчука «Кветкі правінцыі». Аднак «нельга забываць і пра існаванне «дыстанцыі» паміж аўтарам і аўтабіяграфічным персанажам. Мастацкасць твора характарызуецца наяўнасцю пісьменніцкай фантазіі, вымыслу, таму аўтабіяграфізм неабходна разглядаць перш за ўсё як крыніцу набліжэння аўтара да рэальнага жыцця, як жывы, даверлівы дыялог з чытачом» [1, с. 266].

У рамане «Кветкі правінцыі» паказаны лёс Адася Долі. Гэта рэтраспектыўнае асэнсаванне аўтарскай біяграфіі, звязанай з жыццём у Давыд-Гарадку, з юнацтвам. Адася, як і аўтара, жыццё выпрабоўвала на трываласць: мамы рана не стала, а выхаванне ўзяла на сябе бабуля. Успамін пра маці звязаны ў душы героя з цёплым і, разам з тым, надзвычай шчымлівым пачуццём. Глыбокі боль ад страты самага блізкага чалавека з гадамі не праходзіць, не прытупляецца. Нават маючы ўласную сям'ю, жывучы ў горадзе, займаючыся пісьменніцкай працай, Адась жыве думкамі пра маці, бацькоўскі дом, родныя мясціны. Цеплыня і клопат бабулі, безумоўна, сагравалі асірацелае жыццё героя ў дзяцінстве, юнацтве, але без адказу засталося пытанне: чаму трагічны лёс сіраты напаткаў менавіта яго, Адася? У сувязі са смерцю маці хлопчык перажывае пачуццё віны, таму твор напаўняецца матывам пакаяння: «Раптам, на нейкім віражы сваіх думак і ўспамінаў, я зразумеў, што ў смерці маці, відаць, найбольш вінаваты я сам! Я пачаў шкадаваць яе, мёртвую, як жывую, бо жывую не шкадаваў, бо жывой яна якраз была для мяне як усё роўна мёртвая» [2, с. 16]. Аўтабіяграфізм твора ўзмацняецца аповедам ад першай асобы, наяўнасцю «я-героя». У кампазіцыйным плане погляд героя-дзіцяці прадстаўлены аўтарам у выглядзе «дзённіка-споведзі», «запісаў», якія Адась пачаў весці ў юнацкім узросце.

У. Ягоўдзік, як і Г. Марчук, спазнаў беспрытульнае дзяцінства. У яго аповесці «Вочы начніцы» сіроцтва таксама звязана з аўтабіяграфізмам. Аўтар перадаў трывожныя перажыванні падлетка Валерыка Літвінчука. Тэма шчаслівага маленства ў мастацкай літаратуры традыцыйна звязваецца з канцэптам «маці», ідэяй велічнасці мацярынства. Мадэль «антыдзяцінства», наадварот, часцей за ўсё атаясамліваецца са стратай бацькоў. У аповесці «Вочы начніцы» герой паказаны ў той момант, калі ён яшчэ не поўны сірата, але ўжо разумее непазбежнасць свайго трагічнага лёсу. Шчымлівы мацярынскі боль, душэўнае ўзрушэнне маці і сына ў час іх апошняй сустрэчы ў бальніцы яскрава передае мастацкі сінтаксіс:

— Сынок! Сынок мой!.. — моцна-моцна прыціснуўшы да сябе, мама стала абсыпаць мяне пацалункамі [3, с. 48]. Жыццё падлетка азмрочана трагічнымі абставіны, але гэта не перашкаджае яму бачыць прыгажосць свету, развіваць уласныя здольнасці.

Аповед у аповесці У. Ягоўдзіка, як і ў рамане Г. Марчука, вядзецца ад першай асобы, што ўзмацняе эмацыянальны план твора, набліжае яго да споведзі. У творах названых пісьменнікаў назіраецца падабенства ў раскрыцці сюжэта, пабудаванага на апісанні асабістай драмы героя-сіраты, які перажыў смерць маці.

Дзіцячая траўма герояў абодвух твораў у пэўнай ступені «ўраўнаважваецца» ўвагай да «бязбацькавічаў» з боку сваякоў, блізкіх, знаёмых. Пра Валерыка Літвінчука («Вочы начніцы») клапоцяцца бабуля, дзед, цётка Ніна. Магчыма, па гэтай прычыне хлопчык уяўляе сабой выхаваную і нават таленавітую асобу. У школе мастацкія здольнасці Валерыка заўважае настаўніца малявання. Цеплыня і клопат бабулі саграваюць асірацелае жыццё і Адася Долі, героя рамана «Кветкі правінцыі». Дарослыя вучаць падлетка дабрыні, спагадлівасці, чуласці.

Пісьменнікі паказваюць працэс сталення асобы дзіцяці пад уплывам блізкіх людзей, грамадства ў цэлым. Далучэнне героя-сіраты да соцыуму ў творах Г. Марчука і У. Ягоўдзіка адбываецца праз сямейны (бабуля, дзядуля, іншыя сваякі), сяброўскі (дзеці, аднагодкі, неабыякавыя да лёсу сіраты людзі), школьны (настаўнікі) асяродак. Сіроцтва — цяжкае

выпрабаванне, аднак падтрымка неабыякавых людзей дазволіла героям твораў пераадолець складаныя абставіны. Адась Доля і Валерык Літвінчук сфарміравалі ў характары такія пазітыўныя рысы, як адказнасць, давер людзям, адкрытасць, чуласць, здольнасць самастойна рабіць жыццёвы выбар.

Пашыраным канцэптам, звязаным з матывам сіроцтва, з'яўляецца «дом (хата)». Ён актыўна выкарыстоўваецца ў нацыянальнай культуры, звычаях, міфалогіі, мастацкай літаратуры і сімвалізуе радзіму, шчаслівае жыццё. Традыцыйным беларускім домам з'яўляецца хата, якая ў народнай аксіялогіі паўстае як сімвал найвялікшай каштоўнасці: «Свая хатка як родная матка». У Г. Марчука і У. Ягоўдзіка вобраз хаты мае перш за ўсё асобасны сэнс, гэта месца, дзе герой-сірата адчувае цеплыню, клопат, спагаду, падтрымку. Адась Доля і Валерык Літвінчук ва ўспамінах пастаянна вяртаюцца дадому, узнаўляюць у памяці вобраз дарагой сэрцу малой радзімы.

У аўтабіяграфічных творах, як правіла, прысутнічае матыў успамінаў героя, які глядзіць на свет вачамі дзіцяці (рэтраспектыўны план твора) і сталага чалавека (асноўная сюжэтная лінія). Спалучэнне поглядаў дзіцяці і дарослага, так званае «падвойнае бачанне» (П. В. Васючэнка), характэрна прозе В. Казько, у якой на аўтабіяграфічным матэрыяле раскрываецца тэма ваеннага дзяцінства. Дадзеная мастацкая асаблівасць уласціва, на наш погляд, і асобным творам Г. Марчука, У. Ягоўдзіка. Спалучэнне двух поглядаў — дзіцяці і дарослага чалавека — дазваляе канцэптуальна рэпрэзентаваць сіроцтва героя. «Дзіцячы» погляд вызначаецца яркасцю і пранізлівасцю ўспамінаў, аўтабіяграфізмам, спавядальнасцю, багаццем зрокавых малюнкаў, «цяжкімі» душэўнымі перажываннямі, «дарослы» — канцэптуалізацыяй і абагульненнем разважанняў персанажа. Героі твораў Г. Марчука і У. Ягоўдзіка, якія зведалі сірочы лёс, рэалізавалі свой асобасны патэнцыял у «дарослым» жыцці. Так, Адась Доля («Кветкі правінцыі») пераехаў у вялікі горад, стварыў сям'ю, стаў пісьменнікам. Пазіцыя «дарослага» героя Г. Марчука жыццесцвярджальная: «Трэба знайсці сілы і смеласць насіць у сабе мінулае, і яно дапаможа не баяцца смерці. Ave vita!» [2, с. 258].

Атрыбутам «цяжкага» дзяцінства з'яўляюцца вобразы-сімвалы. Прадвесцем бяды для Валерыка, героя аповесці У. Ягоўдзіка «Вочы начніцы», становіцца амяла. Дзед расказвае хлопчыку мясцовае павер'е:

— Гэта амяла, — а па-колішняму — вока Начніцы… Старыя людзі баяліся, што ў амяле хаваецца Начніца, пакуль не прыліпне да чалавечай душы… [3, с. 29]. У беларускай міфалогіі начніца — міфічная істота, у якую пасля смерці ператваралася жанчына, што не мела дзяцей праз шальмоўства і была праклята людзьмі. Паводле народных уяўленняў начніца часцей за ўсё з'яўляецца летам, калі цвітуць травы, радуюць людзей сваімі пахамі зёлкі. Менавіта ў гэты цудоўны час трэба асабліва асцерагацца начніц, якія з'яўляюцца прадвесцем бяды, хваробы або нават смерці. Па-майстэрску выкарыстоўваючы матывы народнага павер'я, У. Ягоўдзік паглыбляе драматычнае гучанне аповесці. Хлопчык да тых пор не верыць мясцовай байцы пра амялу, у якой быццам бы хаваецца начніца, пакуль маці не забіраюць у бальніцу. Падлетак аглядае суседскія дрэвы, але амялу знаходзіць толькі на сваім двары, ён вінаваціць расліну ў сваім горы.

Рэпрэзентаваць сіроцтва дазваляе імя літаратурнага персанажа. На сімвалічнасць прозвішча і імені героя Г. Марчука звяртаюць увагу даследчыкі літаратуры (Е. А. Лявонава): Адась Доля — гэта мастацкае ўвасабленне чалавека і яго долі / лёсу ў беларускім варыянце [4, с. 20].

Уздзеянне на змястоўнасць і тып рэпрэзентацыі праблемы, узнятай пісьменнікам, аказвае эпоха, у якую жыў аўтар, час напісання твора. Блізкасць лёсаў герояў прозы Г. Марчука і У. Ягоўдзіка можа быць абумоўлена тым, што абодва пісьменнікі, фактычна, належаць да аднаго пакалення літаратараў (Г. Марчук нарадзіўся ў 1947 г., У. Ягоўдзік — у 1956 г.). «Кветкі правінцыі» (1986 г.) і «Вочы начніцы» (зборнік прозы, 1989 г.) з'явіліся ў друку амаль адначасова.

У іншым жанры пра сіроцтва расказвае У. Ліпскі — аўтар кнігі «Падкідыш», у якой мастацкі аповед спалучаецца з дакументалістыкай і публіцыстыкай. Цікавасць да праблемы

сіроцтва ў яго ўзнікла не з асабістага вопыту дзяцінства, а ў выніку актыўнай грамадскай дзейнасці (наведванне дамоў дзіцяці, спецшкол, бальніц, асобных сямей і інш.).

Пісьменнік сцвярджае, што ва ўмовах духоўнай разбалансаванасці грамадства асабліва цяжка існаваць дзецям, таму дарослыя павінны абараняць іх ад жорсткасці жыцця. Гэта твор, у якім пісьменнік дакладнымі лічбамі, фактамі гаворыць пра сіроцтва (нярэдка пры жывых бацьках), крызіс сям'і, рост дзіцячай злачыннасці, заклікае «вярнуць дзецям даўгі». Рэпрэзентацыя сіроцтва адбываецца праз выкарыстанне шматлікіх дакументальных фактаў: «Вадзіма Папова знайшлі ў лесе. Халодны і сплаканы ляжаў у кустах. На выгляд чатыры Аўтарскі голас выразна дамінуе ў апавядальнай плыні твора, прымушае задумацца над лёсам дзяцей-сірот пры жывых бацьках.

У. Ліпскі паказвае розныя тыпы вобразаў дзяцей-сірот: 1) «бязбацькавічы», дзеці, пакінутыя бацькамі, «падкідышы»; 2) чарнобыльцы, якіх напаткала двайная бяда: хвароба і сіроцтва; 3) дзеці вайны (Вялікая Айчынная вайна, Афганістан).

Асаблівую трывогу пісьменніка выклікаюць дзеці, ад якіх адмовіліся бацькі. Іх лёс, прычыны сіроцтва самыя розныя:

– падкідышы, «лішнія» дзеці;

– дзеці, пакінутыя бацькамі праз невылечную хваробу, аднак сярод «адказнікоў», заўважае аўтар, ёсць і практычна здаровыя дзеці;

– «дзеці дыскатэк»;

– дзеці, народжаныя «канвеернымі бацькамі».

Вытокі праблемы сіроцтва бачацца пісьменнікам у неабдуманнасці ўчынкаў людзей, якія становяцца бацькамі, аднак па розных прычынах пакідаюць дзяцей. У некаторых выпадках гаворка ідзе пра безадказнасць і нават злачыннасць паводзін дарослых.

Літаратурная рэпрэзентацыя сіроцтва выяўляецца і ў моўным афармленні твора. У. Ліпскі выкарыстоўвае воклічы-звароты, пытанні, заклікі, узрушаныя словы роздумаў. Аўтарскі голас дамінуе ў апавядальнай плыні твора, прымушае чытача звярнуць увагу на сацыяльныя вытокі сіроцтва. У кнізе «Падкідыш», аднак, трагічныя факты не выклікаюць пачуцця безвыходнасці. У. Ліпскі з павагай піша пра людзей, якія даглядаюць сірот у дамах дзіцяці, інтэрнатах, дамах сямейнага тыпу. Нямала і тых, хто ўсынаўляе «бязбацькавічаў», гэтыя людзі, па словах аўтара, «маюць талент любіць дзяцей». У кнізе «Падкідыш» У. Ліпскі не толькі канстатуе факты, звязаныя з праблемай сіроцтва, ён заклікае навучыцца дапамагаць канкрэтнаму чалавеку, асабліва дзіцяці, якое трапіла ў бяду.

***Заключэнне.*** Літаратурная рэпрэзентацыя сіроцтва ў творах У. Ягоўдзіка і Г. Марчука звязана з паказам складаных душэўных перажыванняў героя, наяўнасцю праблемы маральнага сталення персанажа, прысутнасцю аўтабіяграфізму, спавядальнасці. Па-іншаму раскрываецца матыў сіроцтва ў кнізе У. Ліпскага «Падкідыш»: дзякуючы спалучэнню дакументалізму, публіцыстыкі і мастацкай прозы, акцэнт перанесены на грамадскі аспект гэтай праблемы, вызначальным з'яўляецца матыў поўнай, «сацыяльнай» беспрытульнасці герояў, адказнасці дарослых за лёс дзяцей.

Спіс цытуемых крыніц

1. Пучынская, Т. М. Аўтабіяграфізм у рамане Г. Марчука «Кветкі правінцыі» / Т. М. Пучынская // Специалист XXI века : материалы IV Междунар. науч.-практич. конф., 22 октября 2015 г., Барановичи, Респ. Беларусь / редкол. : А. В. Никишова (гл. ред.), А. А. Селезнев, А. В. Прадун (отв. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2015. — С. 264—266.

2. Марчук, Г. Кветкі правінцыі: раман, навелы, афарызмы / Г. Марчук. — Мінск : Маст. літ, 2004. — 416 с.

3. Ягоўдзік, У. Шчыраю ноччу / У. Ягоўдзік. — Мінск : Літаратура і мастацтва, 2009. — 271 с.

4. Лявонава, Е. Традыцыйнае і новае ў апавядальнай стратэгіі рамана «Кветкі правінцыі» Георгія Марчука / Е. Лявонава // Роднае слова. — 2011. — № 10. — С. 17—21.

5. Ліпскі, У. Падкідыш / У. Ліпскі. — Мінск : Беларусь, 1992. — 207 с.